*У райкоме КПБ і райвыканкоме*

# АБ ВЫНІКАХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ РАЁНА

## за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі ў першым квартале 1968 года

Разглядзеўшы вынікі сацыялістычнага спаборніцтва калгасаў і саўгасаў раёна за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі ў першым квартале 1968 года, бюро райкома КПБ і выканком райсавета дэпутатаў працоўных адзначаюць, што калгасы і саўгасы раёна ў спаборніцтве па вытворчасці і продажу мяса дзяржаве дабіліся адпаведных поспехаў. Вытворчасць мяса на кожныя 100 гектараў сельгасугоддзяў у першым квартале бягучага года па раёну павялічылася на 1,1 цэнтнера ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года, а план продажу мяса выканан на 129 працэнтаў.

Бюро райкома КПБ і выканком раённага Савета дэпутатаў працоўных адзначаюць, што з боку асобных праўленняў калгасаў, пярвічных партыйных арганізацый было аслаблена кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак малака. У выніку чаго вытворчасць малака на 100 гектараў сельгасугоддзяў паменшылася на 0,7 цэнтнера ў параўнанні з першым кварталам мінулага года, план нарыхтоўкі малака выканан на 91,4 працэнта, а продажу яек—на 67,9 працэнта.

Бюро райкома КПБ і выканком райсавета дэпутатаў працоўных пастанавілі прызнаць пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак малака калгас „Авангард" (старшыня калгаса тав. [..]лешкін І. Ц., сакратар партарганізацыі тав. Надабед М. М.).

За дасягнутыя поспехі ў вытворчасці і продажу малака дзяржаве калгасу „Авангард" прысудзіць пераходны Чырвоны сцяг райкома КПБ і выканкома райсавета дэпутатаў працоўных, перадаўшы яго з саўгаса „Трасціно". Калгас „Авангард" занесці на раённую „Дошку гонару".

За забеспячэнне прыросту малака на 100 гектараў сельгасугоддзяў і выкананне квартальнага плана яго нарыхтовак саўгас „Забялышына" (дырэктар саўгаса тав. Аліменка А. Д., сакратар парткома тав. Нікіценка І. І.) занесці на раённую Дошку гонару.

У сацыялістычным спаборніцтве за павелічэнне вытворчасці і продажу мяса дзяржаве прызнаць пераможцамі: саўгас „Трасціно", калгасы „Запаветы Леніна", „Чырвоны маяк":

а) пакінуць за саўгасам „Трасціно" (дырэктар тав. Ільмовіч В. Ф., сакратар парткома тав. Міхаленка М. Ф.) пераходны Чырвоны сцяг райкома КПБ і райвыканкома і занесці на раённую Дошку гонару;

б) занесці на раённую Дошку гонару калгасы «Запаветы Леніна» (старшыня тав. Маркевіч А. С., сакратар партарганізацыі тав. Чумасаў С. З.);

«Чырвоны маяк» (старшыня тав. Пракопенка І.І., сакратар партарганізацыі тав. Казлоў К.К.).

У сацыялістычным спаборніцтве сярод калектываў малочнатаварных ферм раёна за павелічэнне вытворчасці малака прызнаць пераможцам калектыў работнікаў Канаўскай малочнатаварнай фермы калгаса імя Карла Маркса (брыгадзір комплекснай брыгады тав. Барыбкін М. П.). На ферме ў першым квартале гэтага года атрымалі малака ад кожнай фуражнай каровы па 473 кілаграмы.

Калектыў работнікаў фермы з а н е с ц і на раённую Дошку гонару.

За дасягнутыя поспехі ў выкананні індывідуальных абавязацельстваў па вытворчасці малака і мяса занесці на раённую Дошку гонару групу перадавікоў —жывёлаводаў раёна.

Адзначыць нездавальняючую работу па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, вытворчасці і продажу малака дзяржаве праўленняў і пярвічных партарганізацый калгасаў: імя XXI з'езда КПСС (старшыня тав. Родзькін П. С., сакратар партарганізацыі тав. Грышчанка М.С.); „Іскра" (старшыня калгаса тав. Чэрнікаў С. Д., сакратар партарганізацыі тав. Сотнікаў І. А.); „Рассвет" (тт. Мічурэнка М. І., Яращэнка Л. А.); «Кастрычнік» (тт. Белаусаў І. Ф., Родзькін М. С.), дзе дапушчана зніжэнне вытворчасці малака і не выканан план яго продажу. Калгас «Рассвет» знізіў вытворчасць мяса і не выканаў план продажу яго дзяржаве.

Патрабаваць ад кіраўнікоў гэтых гаспадарак прыняць практычныя меры да павелічэння вытворчасці і продажу прадуктаў жывёлагадоўлі.

Абавязаць сакратароў партарганізацый калгасаў і саўгасаў, кіраўнікоў гаспадарак раёна абмеркаваць на адкрытых партыйных сходах вынікі сацыялістычнага спаборніцтва па вытворчасці і продажу прадуктаў жывёлагадоўлі за першы квартал, распрацаваць мерапрыемствы, забяспечваючыя выкананне прынятых абавязацельстваў у гонар юбілею БССР і Кампартыі Беларусі.

**Аб выніках сацыялістычнага спаборніцтва калгасаў і саўгасаў раёна : за павелічэнне вытворчасці і нарыхтовак прадуктаў жывёлагадоўлі ў першым квартале 1968 года** // Шлях Кастрычніка.